3. *Ян, Чуньсюэ.* Обзор исследований по преподаванию китайского языка как иностранного с 2000 г. [Электронный ресурс] / Ян Чуньсюэ // Mianyang Normal University. – 2008. – № 12. – С. 140–143.
4. Актуальные вопросы методики преподавания китайского языка : сб. метод. материалов. – Владивосток : Изд-во Дальневост. ун-та. –2010. – 36 с.
5. *Бессмельцева, Е. С.* Межпредметная интеграция в обучении студентов неязыковых факультетов иностранному языку [Электронный ресурс] / Е. С. Бессмельцева. – Режим доступа: http://cyberleninka.ru/article/n/mezhpredmetnaya-integratsiya-v-obuchenii-studentov-neyazykovyh-fakultetovinostrannomu-yazyku. – Дата доступа: 23.08.2022.
6. *Гальскова, Н. Д.* Теория обучения иностранным языкам. Лингводидактика и методика : учеб. пособие для студентов лингв. ун-тов и фак. ин. яз. высш. пед. учеб. заведений / Н. Д. Гальскова, Н. И. Гез. – 5-е изд., стер. – М. : Академия, 2008. – 336 с.
7. *Демина, Н. А.* Методика преподавания практического китайского языка Н. А. Демина. – 2-е изд., испр. и доп. – М. : Вост. лит., 2006. – 88 с.
8. *Кочергин, И. В.* Очерки методики обучения китайскому языку : науч. изд. / И. В. Кочергин. – М. : ИД Муравей, 2000. – 160 с.
9. *Маркова, О. Ю.* Страноведческий аспект профессиональной подготовки студентов туристского ВУЗа в процессе изучения иностранного языка [Электронный ресурс] / О. Ю. Маркова. – Режим доступа: http://www.dissercat.com/content/stranovedcheskii-aspekt-professionalnoi-podgotovkistudentov-turistskogo-vuza-v-protsesse-iz. – Дата доступа: 09.11.2021.
10. *Попова, Н. В.* Междисциплинарная парадигма как основа формирования интегративных компетенций студентов многопрофильного вуза (на примере дисциплины «Иностранный язык») : автореф. дисс. … д-ра пед. наук : 13.00.08 / Н. В. Попова. – СПб., 2011. – 50 с.
11. *Семенова, Т. М.* Обзор исследований в области методики преподавания китайского языка / Т. М. Семенова // Молодой ученый. – 2012. – № 12 (47). – С. 510–512.

*Г. Ю. Лявоненка (Беларусь)*

# РАМАНТЫЧНАЯ ПЛЫНЬ У ПОЛЬСКАЙ І БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРАХ ПА-ЗА ЧАСАМ І КУЛЬТУРАМІ. ПРАДСТАЎНІКІ І ПРАДАЎЖАЛЬНІКІ

Рамантызм у мастацтве з’явіўся ў канцы XVIII – пачатку XIX ст. У кожнай з краін рамантызм стаў рэакцыяй на падзеі ўнутры краіны, працэсы, якія праходзілі праз душы людзей.

Мы ў сваім артыкуле хочам звярнуцца да літаратурных працэсаў сучаснай і тагачаснай Беларусі і Польшчы. У Польшчы рамантызм з’явіўся паміж 1815 і 1831 гг. як рэакцыя на вызваленчыя імкненні польскага народа, ён жа стаў сцягам руху за нацыянальнае адраджэнне, за зваржэнне феадальна-абсалютыстскага прыгнёту [2, с. 182]. Але пунктам адліку рамантычнай эпохі на тэрыторыі сучаснай Польшчы стаў зборнік «Балады і рамансы» Адама Міцкевіча, які выйшаў у 1822 годзе. Том стаў штуршком своеасаблівай рэвалюцыі ў польскай літаратуры. Аднак перад гэтым А. Міцкевічам быў напісаны артыкул «Аб рамантычнай паэзіі», у якім пісьменнік заклікаў да неабходнасці далучэння да агульнаеўрапейскага рамантызму [2, с. 194]. Разам з тым на тэрыторыі тагачаснай Польшчы дзейнічаюць розныя арганізацыі (памятаем пра філаматаў і філарэтаў), многія з іх прадстаўнікоў маюць магчымасць пашыраць свае сацыяльныя кантакты, што спрыяе развіццю літаратурных сувязяў.

На сённяшні дзень у гісторыі беларускай літаратуры традыцыя налічвае шмат разнастайных літаратурных напрамкаў, аднак, не гледзячы на гэта, рамантычнасць праходзіць праз кожную эпоху і пакідае свой адбітак на літаратурнай спадчыне розных часоў. На сённяшні дзень упэўнена можна гаварыць пра тое, што Я. Купала, М. Багдановіч, М. Танк, Н. Гілевіч, У. Караткевіч і г. д. з’яўляліся рамантыкамі. Аднак мы ведаем, што кожны з гэтых пісьменнікаў на сённяшні дзень з’яўляецца класікам сваёй літаратуры. Як звязана паняцце «класік» і «рамантык»? Гэтыя два паняцці і іх сумежнасць падкрэслівае ў сваім даследаванні П. Валеры: «Адрозненне паміж класікам і рамантыкам дастаткова простае. Гэта адрозненне паміж тым, хто недасведчаны ў сваім рамястве, і тым, хто ім авалодаў» [1, с. 155]. Менавіта класік і авалодаў сваім рамяством згодна с заключэннем даследчыка. Аднак рамантычная плынь не знікла. Пісьменнікі, як і кожны іншы чалавек, адчувалі шырокі спектр эмоцый, дзякуючы чаму, каб больш поўна адлюстраваць свае пачуцці, звярталіся да міфалогіі і фальклору як першакрыніц. Узгадаем рамантычныя творы А. Міцкевіча з міфалагічным кампанентам «Свіцязянка», «Свіцязь», «Ліліі», а пазней гэтую традыцыю вельмі дасканала і трапна працягвае М. Багдановіч, у творчасці якога з’яўляюцца «Страцім-лебедзь», «Вадзянік», «Змяіны Цар». Зараз мы можам звярнуцца да творчасці Л. Рублеўскай, якая ў форме казкі пераказала гісторыю, расказаўшы яе ад імя літаратурнага героя «Авантуры Студыёзуса Вырвіча».

Але звернемся да параўнанняў аўтараў ХХ стагоддзя. Максім Танк пачаў пісаць, калі на тэрыторыі Беларусі панаваў сацыялістычны рэалізм, у гэты ж час, з розніцай усяго год у Літве нарадзіўся Чэслаў Мілаш. Максім Танк нарадзіўся ў 1912 г., Чэслаў Мілаш – 1912 г., калі ў Польшчы ўжо пачалася эпоха Маладой Польшчы. З рознай доляй і рознымі поглядамі на жыццё гэтыя пісьменнікі амаль дубліравалі думкі адно аднаго, а хутчэй за ўсё яны адлюстроўвалі думкі грамадства. Не будучы знаёмымі, маючы толькі агульныя крыніцы натхнення (прырода, людзі, сусвет), гістарычныя падзеі (абодва пісьменнікі бачылі на свае вочы вайну).

Разгледзім на прыкладах. У вершы М. Танка «Іван-ды-Мар'я» (1945) такія радкі: *«Іван сказаў ёй: «Даўно пара нам / Спытаці шчасця, / Чым жыць і гінуць век у кайданах, / Лепш вольным пасці...»*

У гэтым вершы адлюстравана не проста легенда, але сцэна настолькі моцнага кахання, якое дазваляе быць разам нават пасля смерці. Гэта спалучаецца з тэмай вызвалення і свабоды, якую ўсё жыццё шукаюць літаратурныя героі.

На два гады раней з'яўляецца верш Чэслава Мілаша «Campo di Fiori» створаны ў лепшых традыцыях Маладой Польшчы, аднак праблема твора ў тым, што, нягледзячы на жах гістарычных падзей (вайна, смяротныя пакаранні, забойствы), людзі працягваюць жыць далей, усё так жа смяяцца, радавацца жыццю. Але пісьменніка хвалюе доля памерлых, і ў гэты момант мы прыходзім да сутнасці жыцця, якая доўгі час хвалявала рамантыкаў. *«Ja jednak wtedy myślałem / O samotności ginących. / O tym, że kiedy Giordano / Wstępował na rusztowanie, / Nie znalazł w ludzkim języku / Ani jednego wyrazu, / Aby nim ludzkość pożegnać, / Tę ludzkość, która zostaje» («Я, аднак, ужо тады падумаў / Пра самоту тых, хто памірае. / Пра тое, што калісьці Жардано / Выступаў на эшафоце, / Не знайшоў у мове людзкой / Ніводнага выразу, / Каб развітацца з чалавецтвам, / Тым чалавецтвам, якое застаецца»).*

У XX стагоддзі адбываецца пераасэнсаванне паняццяў Бог, Рай, Пекла, і некаторыя з пісьменнікаў прыходзяць да таго, што мастацтва дапускае абсалютна розныя светапогляды, што і адлюстроўваецца ў творах. Адным з такіх прыкладаў з'яўляецца верш «Ave Maria» М. Танка, датаваны 1957 г.: *«Нат пад жалобнай вопраткай чорнай / Ты адгадаеш: стан непакорны, / Ножкі, якімі б на карнавалах / І захапляла і чаравала, / Смуглыя рукі, грудзі тугія, – / Ave Maria!»*

Рэлігійнасць у эпоху Рамантызму – тое, што з'яўляецца неадназначнай, але актуальнай праблемай сучаснай літаратуры, а ў каталіцкай Польшчы гэтае пытанне стаіць больш востра нават сёння. У 1985 г. з'яўляецца верш пад назвай «Марыя Магдаліна і я», дзе даецца наступнае апісанне вучаніцы Хрыста: *«Jej włos kasztanowaty zwija się w pierścienie / I okrywa jej plecy, silne, prawie męskie, / Kładąc się na ramieniu w ciemnomodrej sukni, / Pod którą nagość jej fosforyzuje» («Яе волас каштанавы звіваецца ў грудзі / І адкрывае яе спіну моцную, амаль мужскую, / Падае на плечы ў цемна-сіняй сукні, / Пад якой нагата яе фасфарыцыруе»).*

Скончыць гэтае параўнанне хочацца вершам М. Танка (1976) «Я спытаў чалавека…»: *«Я спытаў чалавека, / Які прайшоў праз агонь, / І воды, / І медныя трубы: / – Што самае цяжкое / На гэтым свеце? / І ён адказаў: / – Прайсці праз вернасць».*

Тэма вечнасці, незвычайныя формы, асэнсаванне жыцця – упершыню пра гэта задумваліся Вертэр, Гяур, Конрад Валенрод, Кордыян. Пра гэта працягваюць разважаць і лірычныя героі сучасных аўтараў. Менавіта тэму вечнасці ўздымае Чэслаў Мілаш у сваім творы пад саркастычнай назвай «Песенка пра канец свету» (1945). Хтосьці працягвае жыццё, нічога не чакаючы, п'яніца засынае на газоне як заўсёды, жанчыны бягуць з поля пад парасонамі, хтосьці чакае маланкі і грому, аднак адзін стары ў гэты час: *«Tylko siwy staruszek, który*

*byłby prorokiem, / Ale nie jest prorokiem, bo ma inne zajęcie, / Powiada przewiązując pomidory: / Innego końca świata nie będzie, / Innego końca świata nie będzie» («Толькі сівы стары, які быў бы пракокам, / Але не з'яўляецца пракокам, бо ў яго іншыя справы, / Кажа, падвязваючы памідоры: / Іншага канца свету не будзе, / Іншага канца свету не будзе»).*

Такім чынам, мы бачым на прыкладах двух аўтараў розных сацыяльных узроўняў, што рамантызм сустракаецца і ў творчасці аўтараў розных краін у ХХ стагоддзі на абсалютна розных этапах развіцця канкрэтных літаратур. Да можна прывесці і шматлікіх сучасных аўтараў, напрыклад, Л. Рублеўская, Н. Бабіна, Я. Вішнеўскі, творчасць якіх паказвае на наяўнасць шырыні рамантычных тэндэнцый у літаратуры, якія існуюць і ў наш час.

## Літаратура


1. *Валери, П.* Об искусстве / П. Валери. – М. : Искусство, 1976. – 622 с.
2. История польской литературы : в 2 т. / Акад. наук СССР. – М. : Наука, 1968. – Т. 1. – 616 с.


*З. П. Мельнікава (Беларусь)*

# МАСТАЦКА-ФІЛАСОФСКАЕ АСЭНСАВАННЕ ЛЁСУ ЧАЛАВЕКА І НАРОДА Ў КАНТЭКСЦЕ ГІСТАРЫЧНЫХ ПАДЗЕЙ У ПАЭМЕ МАКСІМА ТАНКА «ЯНУК СЯЛІБА»

У творчасці кожнага таленавітага мастака, як правіла, увасабляюцца важныя для самога творцы, для народа, а часта і для ўсяго чалавецтва ісціны, маральныя імператывы, духоўныя ідэі і прынцыпы, якія маюць непераходзячае значэнне. Іх называюць вечнымі каштоўнасцямі. Гэта, звычайна, хрысціянскія, этычныя, духоўна-эстэтычныя катэгорыі – маральнасць, сумленнасць, гуманізм, дабрыня, жыццё, справядлівасць, подзвіг, ісціна і іншыя. Часта канкрэтна-гістарычныя прычыны, якія падштурхнулі аўтара да напісання твора і сталі яго асноўным зместам, страчваюць сваю актуальнасць для новых пакаленняў рэцыпіентаў. Але твор застаецца запатрабаваным і праз многа дзесяцігоддзяў і нават стагоддзяў, бо ў ім увасоблены вечныя, хвалюючыя людзей ва ўсе часы праблемы, ісціны, ідэі. Сцвярджэннем вечных каштоўнасцей вызначаюцца творы нацыянальнай і сусветнай класікі, і гэта забяспечвае іх нязменную філасофска-эстэтычную і рэцэптыўную актуальнасць. Увасабленне каштоўнасных дамінант у творы адбываецца праз мастацкую рэалізацыю аўтарам канцэптаў высокага, узвышанага, прыгожага – устойлівых паняццяў класічнай эстэтыкі. У сучасным